1-46 to.30

Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 1 (500) Вільня, Нядзеля 8 Студзеня 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская Крыніца

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА“ каштуе на год — 4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

З новым — 1933 годам!...

Кліч гэты азначае прывітаньне нашых чытачоў, прыяцеляў, аднадумцаў, а так-жа і ўсяго Беларускага народу з прычыны Новага Году. Кліч гэты азначае так-жа найлепшыя пажаданьні на пачаты Новы Год усім тым, з кім і для каго мы працуем.

Але ці не за шмат сьмеласьці ў нас складаць новагоднія пажаданьні, калі зусім не заносіцца на тое, каб Новы Год ды прынёс беларускаму народу хоць праблыск надзеі на лепшую долю ягоную, калі кругом пануе цемень, кругом галіта, кругом бяздольле?!

Сяньня сапраўды так ёсьць. Гэта горкая праўда. Але так-жа-сама праўда і тое, што гэтак быць не павінна, што гэтак заўсёды ня будзе і што сьвятым ёсьць абавязкам усіх людзкіх адзінак і народаў каваць сабе лепшую долю. Абавязак гэты тым больш цяжыць на беларускім народзе і абавязак гэты сапраўды выконваецца, а ў Новым сёлетнім Годзе выконвацца далей павінен і будзе. Жаданьне, такім чынам, памыснасьці беларускаму народу ў выкананьні яго вызвольна-адраджэнскага абавязку ў Новым Годзе ёсьць рэчай поўнай сэнсу і значэньня.

Бадай на ўсім сьвеце пануе крызыс-хвароба — і эканамічна-грамадзкая і духовая. Пануе галіта фізычная і моральная. Сьвет кідаецца ўва ўсе бакі, шукаючы выхаду. Жаданы выхад, хоць па цяжкіх муках, сьвет гэты знайдзе сапраўды. Адвечная Мудрасьць, што фізычным і духовым сьветам кіруе, дапаможа яму выйсьці на прасторны шлях праўды, дабрабыту, справядлівасьці.

Тузаецца скаваны ланцугамі нядолі і народ беларускі. Прыйдзе аднак і для яго лепшы дзень, — дзень долі і волі і роднай культуры.

Па ўсей Эўропе будзяцца да новага самастойнага жыцьця старыя, заціснутыя сілай, народы: Ірляндцы, Каталёнцы, Брэтанцы, Флямандцы і інш. Усе яны — жывы ўзор для Беларусаў, жывы прыклад, што ўсё на сьвеце ідзе да лепшага, што народы ня ўміраюць.

Такім-жа жывым прыкладам, жывым доказам лепшага жыцьця для беларускага народу служыць адраджэньне вялікага — і старадаўнай культурай і лікам — народу індускага, які шаг за шагам, крывёй часта шагі свае пячатаючы, вырываецца з „клыкоў брытыйскага льва“ на шырокі прастор свайго нацыянальнага і соцыяльнага адраджэньня.

Доказам лепшай долі для Беларусаў служаць так-жа і блізкія нашы суседзі — Літоўцы, якія хоць не па ўсёй сваёй тэрыторыі, збудавалі свой «Дом народны» і Украінцы, якія ў будаваньні такога-ж свайго дому выказалі і выказваюць так шмат мужства, так шмат зложылі жэртваў, а імкненьняў якіх ужо ня спыніць ніякая сіла.

Вось-жа й народ беларускі, кіраваны гэнымі вымоўнымі для яго ўзорамі-прыкладамі, а прадусім сваей уласнай унутранай патрэбай, у сваім вызваленскім адраджэньні, ня гледзячы на цяжкія абставіны свайго жыцьця, не стаіць на мейсцы, а сапраўды ідзе ўперад. Бачым мы гэта як у Усходняй, так і ў Заходняй Беларусі.

У Усходняй Беларусі, пад панаваньнем камуністаў, беларускі народ, як народ, не прызнаецца. Будаваньне камунізму, хоць-бы коштам сялян і работнікаў — вось там найвышэйшы ідэал. Аднак ідуць там да гэтага ідэалу — трэба прызнаць — пераважна шляхам беларускім. Газэты і кнігі пішуцца і выдаюцца пабеларуску, школы там так-жа беларускія — ад пачатковых да вышэйшых. Словам, у Беларусі пад бальшавікамі — агулам кажучы — зьмест жыцьця небеларускі, нават антыбеларускі, але форма беларуская. Адбываецца там значны рост культуры беларускага слова, беларускай мовы. А гэная форма жыцьця, гэная выробленая культурна беларуская мова станецца некалі аднэй з падставаў беларускага ўсенароднага адраджэньня, адным з матываў, вядучым народ да таго, каб ён сам узяў свой лёс у свае рукі.

У Заходняй Беларусі — у Беларусі пад Польшчай — польскі нацыяналізм народу беларускага, як народу, так-жа не прызнае. У бальшавікоў існуюць толькі грамадзяне камуністычнай дзяржавы, а ў Польшчы існуюць толькі грамадзяне польскай дзяржавы. Аднак як там, як мы бачылі, беларускасьць цалком не загінула, так яна цалком не загінула і тут. І тут знашліся мяйсцы, дзе з гушчароў польскага нацыяналізму і польскай дзяржаўнасьці, беларуская нацыянальная ідэя выпускае расткі, жыва разьвіваецца і — як ня дзіва — дасьпявае і дае плады. Адзінымі праваднікамі беларускай нацыянальнай ідэі ў Польшчы зьяўляецца ідэова незалежная газэта і кніжка. Праваднік гэты, ведама непаказісты, аднак заданьне сваё ён спаўняе.

Тое-ж бадай што ў Польшчы, апошнім часам пачынае з Беларусамі дзеецца і ў Латвіі. І там тая-ж родная газэта і родная кніжка мае ратаваць беларускую нацыянальную ідэю.

Вось-жа „Беларуская Крыніца“, стоячы на парозе 1933 г. — семнаццатага году сваей працы на беларускай ніве — і жадае Беларусам у гэтым Новым Годзе выкарыстаць усе тыя магчымасьці для нацыянальнай беларускай ідэі, якія вядуць народ беларускі да нацыянальнага, соцыяльнага і культурнага вызваленьня і да эканамічнага дабрабыту.

Дык з Новым Годам!...

З беларускага жыцьця.

Новая полёнафільская пляцоўка — Т.Б.А. Гэтыя тры літары абазначаюць скарочаны назоў новага полёнафільскага новатвора на беларускім арганізьме, быццам „культурна-прасьветнага — Таварыства Беларускае Асьветы“, статут якога ўлада зацьвердзіла ў канцы сьнежня 1932 г. Гэнае Т-ва пачало ўжо выдаваць і свой орган пад назовам «Родны Край»., Нічога тут новага на полёнафільскім фронце ня сталася, бо толькі зьменены шыльд з „Цэнтрасаюзу“ на Т.Б.А., а на мейсца «Беларускага Звону» пачаў выходзіць «Родны Край», „рэдагаваны“ тым-жа нязьменным Сіняўскім. Да гэтай справы вернемся яшчэ ў наступным нумары.

Папраўка. У сувязі з зацемкаю аб час. „Нёман“ у № 44 з 1932 г. „Беларускае Крыніцы“ ў аддзеле «З беларускага жыцьця» нас просяць з рэд. „Нёмна“ адцеміць, што ў канцы арт. „Тварэньне новых словаў“ на 199 бач. „Нёмна“ замест „мороженое“ мае быць „пирожное“.

Да „Беларускага Народнага Календара“ Ўл. Знамяроўскага. Сёлета Ўл. Знамяроўскі, асабліва ведамы з выданьняў сваіх календароў, выдаў календарык-кніжачку на 1933 г. пад назовам «Беларускі народны календар». Нас просяць наказаць, што календарык-кніжачка Знамяроўскага нічагусенькі ня мае супольнага з „Беларускім народным календаром“ з 1927 і 1929 г.

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

Уладыслаў Галубок 1882—1932. У мінулым 1932 годзе скончыў 50 гадоў жыцьця вельмі папулярны ў Савецкай Беларусі драматычны пісьменьнік і сцэнічны дзеяч Ул. Галубок (праўдзівае прозьвішча: Голуб). Галубок належаў сьпярша да групы «нашаніўцаў» і друкаваў свае апавяданьні і вершы ў „Нашай Ніве“. Пазьней пачаў пісаць драматычныя творы — „Апошняе спатканьне“ і шмат іншых. У 1923-24 г. г. Галубок сарганізаваў у Савецкай Беларусі беларускі аб'язны тэатр, які і цяпер разьяжджае па сёлах Усходняй Беларусі.

Беларусізацыя і русыфікацыя. Ужо некалькі гадоў праводзіцца ў Радавай Беларусі беларусізацыя, але адначасна праводзіцца і русыфікацыя. «Савецкая Беларусь» з дня 14.XII.1932 падае: у Шклоўскім раёне, у фабрыцы «Спартак», працуе 900 работнікаў. Па нацыянальнасьці блізу ўсе беларусы. Ёсьць некалькі жыдоў, а яшчэ менш палякоў. Расейцаў няма. Адміністрацыя фабрыкі аднак вядзецца парасейску. У канцэлярыі фабрыкі ня толькі пішуць парасейску, але гавораць між сабою і да работнікаў — беларусаў толькі парасейску. Фабрычная камуністычная ячэйка нарады і сходы адбывае так-жа парасейску.

«Зьвязда» з дня 13.XI.1932 г. у стацьці пад загалоўкам „Няма часу займацца нац-палітыкай“ падае: у Гомельскім вагона-будаўляным заводзе працуе 2.465 работнікаў беларусаў, 200 жыдоў, некалькі дзесяткаў палякоў і 64 расейцы. Адміністрацыя заводу вядзецца выключна парасейску. На фабрычных зборках гавораць толькі парасейску. Служачыя канторы забараняюць работнікам-беларусам гаварыць пабеларуску, трэбуючы, каб гаварылі парасейску. У фабрычнай бібліятэцы няма аніводнай беларускай кніжкі. Уся літэратура ў гэтай бібліятэцы выключна расейская.

З гэтага бачым, што побач з беларусізацыяй праводзіцца і русыфікацыя Б.С.С.Р.

БЕЛАРУСЫ Ў ЛАТВІІ.

„Беларуская Школа ў Латвіі,“ № 6, Рыга, Лістапад 1932, папулярна-навуковы, пэдагогічны і літэратурна-грамадзкі штомесячнік выйшаў з друку і шырока апісвае аб беларускім жыцьці ў Латвіі. Між іншым падае, што Беларуская Гімназія ў Дзьвінску і надалей будзе працаваць у поўнай лічбе клясаў, бо міністр Кенынш „адпусьціўся“ і спыніў паступовую ліквідацыю гэтай гімназіі. Але ці на доўга мін. Кенынш адпусьціўся?

БЕЛАРУСЫ Ў ЛІТВЕ.

Беларускі Народны Ўнівэрсытэт у Літве. Заграпічныя газэты падаюць, што „Беларускае Культурна-Асьветнае Т-ва ў Літве“ атрымала ад літоўскага ўраду ў Коўне дазвол на адкрыцьцё ў Літве Беларускага Народнага Ўнівэрсытэту. Унівэрсытэт пачынае сваю дзейнасьць ад 20 гэтага месяца.

Да працэсу Т.Б.Ш.

Як мы даведаліся, працэс Т. Б. Ш. вызначаны на 1 лютага с. г. Перад судом стане ўвесь склад прэзыдыуму Галоўнае Управы Т.Б.Ш., а іменна: старшыня — Фэлікс Стэцкевіч, віцэ-старшыня — Міхал Петкевіч і сэкрэтар (ён-жа часовы скарбнік) — Рыгор Шырма. Ім закідваецца прыналежнасьць да «камуністычнай фракцыі спасярод Т.Б.Ш.“. Гэта праступства прадугледжана 102 арт. Код. Карн. Усе абвінавачаныя, выпушчаныя з арышту на Лукішках вясною 1931 г., знаходзяцца на волі і будуць адказваць перад судом „z wolnej stopy“.

Адначасна з прэзыдыумам Галоўнае Управы Т.Б.Ш., перад тым-жа судом будуць адказваць яшчэ тры асобы: грам. грам. Цэрах, Юльян Саковіч і Сяргей Скурка, з якіх Цэрах належаў да т. зв. другой Дачаснай Камісіі Т.Б.Ш. Усім ім акт абвінавачаньня закідвае прыналежнасьць да К.П.З.Б.

13232

241098

Присуд сьмерці ў Львове.

У мінулую восень дакананы быў збройны напад на пошту у Гарадку, у Галіччыне, з мэтай забраньня грашэй.

Гэты напад прыпамінае нам прадваенны напад на цягнік у нашым краю ў Бэзданах. Розьніца між імі толькі тая, што за напад у Бэзданах нікога на сьмерць не засудзілі, бо напасьнікаў расейская паліцыя не злавіла, а за напад у Гарадку, па пастанове суду, 2-х украінцаў павесілі.

У справе нападу ў Гарадку, у Львове адбыўся даразны суд, які цягнуўся ад 17 да 22 сьнежня 1932 г. Судзілі: Базыля Біласа, Дымітра Данілышына, Міраслава - Мар'яна Журакоўскага і Зэнона Коссака. Усе яны маладыя хлопцы ад 21 да 27 гадоў, па народнасьці: украінцы.

Акт абвінавачаньня вінаваціў першых трох за напад у Гарадку з мэтай забраньня грашэй і цьвердзіў, што ўсе абвінавачаныя належалі да ўкраінскай арганізацыі ОУН.

Пракурор, вінавацячы падсудных, казаў: у лістападзе ОУН склікала ўсіх баявікоў у Львоў. На гэты прыказ Коссак выслаў у Львоў Журакоўскага, Данілышына і Біласа. Найважнейшае заданьне, забраць грошы, мелі Білас і Данілышын, бо гэта былі выпрабаваныя баявікі. Напасьнікі стралялі, каб забраць грошы для ОУН і забілі паштовага ўрадніка і паліцэйскага. Пракурор казаў, што Данілышын і Білас забілі і пасла Голувку.

Падсудныя ў апошнім слове сказалі: — Данілышын: „я знаю, што мяне чакае. Жаль мне толькі, што не змагу ўжо працаваць для Украіны". Білас: „я сьведамы сваей віны і кары! Я нацыяналіст-рэвалюцыянэр". Журакоўскі і Коссак ад апошняга слова адмовіліся.

Дня 22.XII. а гадз не 11.20 прачытаны сьмяротны прысуд. Данілышын, Білас і Журакоўскі засуджаны на кару сьмерці праз павешаньне, а справу Коссака пастанавіў суд перадаць у звычайны суд.

Абарона прасіла трыбунал суду, каб прадставіў засуджаных на памілаваньне Прэзыдэнту, запавядаючы, што такую-ж просьбу падае і ад сябе. Пракурор спрацівіўся, каб суд прадстаўляў на памілаваньне Данілышына і Біласа, не працівячыся толькі адносна Журакоўскага.

Засуджаныя прысуд прынялі спакойна.

А гадзіне 4.30 надышла тэлеграма, што Прэзыдэнт Данілышына і Біласа не памілаваў, а засуджанаму на сьмерць Журакоўскаму замяніў кару сьмерці на 15 гадоў катаргі.

Выкананьне прысуду сьмерці над непамілаванымі адбылося 23. XII. м. г. а гадзіне 6 мін. 30 раніцы. Грэка-каталіцкі ўкраінскі сьвяшчэньнік выспавядаў абодвух і тады іх вывелі на турэмны панадворак, дзе і павесілі. Першага павесілі Данілышына, а пасьля Біласа.

Адначасна, як падаюць газэты, у некалькіх львоўскіх цэрквах адпраўлялі паніхіду за душы Біласа і Данілышына. J.

З Польшчы.

Ці за славамі будзе дзела? Старшыня ўраду, палкоўнік Прыстор, надовячы ў Сэнаце с азаў прамову, у якой між іншым зьвярнуў увагу на цяжкое палажэньне сялянства. Старшыня ўраду сказаў, што сучасны гаспадарчы крызыс найбольш прыцісную сялянства, бо найбольш абясцэнены іх прадукты і вытварылася несправядлівая розьніца між цэнамі земляробскай прадукцыі і фабрычнымі таварамі. Дзеля гэтага, казаў старшыня ўраду Прыстор, трэба датасаваць цэны фабрычных тавараў да цэнаў прадукцыі земляробскай, дык тады ажывіцца і промысел. Гэтак гаварыў сам старшыня ўраду. Але сама гаворка справе не паможа. Трэба, каб за славамі пашло дзела. Няхай улада прымусіць фабрыкантаў панізіць цэны на свае вырабы, а тады сапраўды палягчэла-б крыху сялянству. Але ці на гэта ўрад здабудзецца?

Галодны горад. Каля Чэнстаховы ёсьць гарадок Заверце. Мае ён 33 тысячы насяленьня. У гэтым горадзе ёсьць цяпер 25 тысяч безработных. Дзеля гэтага ў гэтым горадзе пануе вялікае гора і голад. Многа крамаў збанкрутавала, бо сьпярша давалі тавары на крэдыт, а цяпер не маглі зыскаць грошай.

З заграніцы.

Сусьветныя цяжары. Першы цяжар, які наймацней гняце людзкасьць гэта страшэнныя выдаткі на ваенные збраеньне. Пад гэтым цяжарам гнуцца да зямлі народы і трашчаць дзяржаўныя бюджэты. Гэтыя выдаткі забіраюць блізу палавіну ўсіх дзяржаўных выдаткаў і гэтым спыняюць разьвіцьцё жыцьцёвых галін у народзе. Яны сталіся прычынай міжнароднага недаверу і заўсёднай пагрозай сусьветнай разьні

Другі цяжар гэта ваенныя даўгі. Многія дзяржавы ў часе сусьветнай вайны пазычалі сабе грошы на ваенныя выдаткі. Цяпер, як прышлось сплачываць гэтыя даўгі, дык аказалася, што даўгі гэтыя задоўжаным дзяржавам непасільны, бо народ і бяз гэтага гнецца пад цяжарам жыцьцёвых бедаў і падаткаў на новае збраеньне.

Трэці цяжар гэта ўсьцяж узрастаючае безрабоцьце, якое аканчальна нішчыць жыцьцё працоўных мас. Капіталістычны строй выяўляе поўную няздарнасьць змагацца з гэтай праявай у жыцьці. У Зл. Шт. Амэрыкі налічваюць 15 мільёнаў безработных. На цэлым сьвеце лік безработных узрос да 34 мільёнаў асоб. Што раз шырэй масы пераконваюцца, што толькі аснаўная зьмена сучаснага ладу зможа прынесьці сталую паправу жыцьця мільёнам безработных.

Нямеччына ў міжнароднай сям'і збраеньня. Да гэтай пары, ад канца сусьветнай вайны, Нямеччына была пазбаўлена права зброіцца. На канфэрэнцыі дзеля разбраеньня яна паставіла гэту справу рубам і ў канцы здабыла сабе гэтыя правы. Правы гэныя Нямеччыне прызналі гэтымі часамі на канфэрэнцыі ў Жэнэве: Англія, Францыя, Італія і Амэрыка. Цяпер Нямеччына ўжо мае права і будзе зброіцца адкрыта.

Падгатоўка да вайны. У Софіі, сталіцы Баўгарыі, нядаўна адбылася тайная канфэрэнцыя генэральных штабаў: Італіі, Вугоршчыны, Баўгарыі і Альбаніі, на якой апрацаваны плян ваеннага супрацоўніцтва гэтых дзяржаў на выпадак вайны з Югаславіяй.

Дэкрэт аб каровах у С.С.Р.Р. Савет народных камісараў выдаў дэкрэт, паводле якога сяляне змушаны даваць у казну малако ад 50 да 250 літраў ад каровы ў год. Гэты налог малака ўстанаўляе асобная камісія, якая бярэ пры гэтым пад увагу район малочнасьці. Калектывы будуць даваць малака на палавіну менш, а прыватныя гаспадары мусяць аддаць поўны налог.

Гэты спосаб падатку нашы сяляне ведаюць, бо выконвалі яго падчас нямецкай акупацыі.

Шапка даражэйшая за каня.

Цяжкія часы цяпер для сялянства. Конь танейшы за шапку.

Агенцыя „Тегоі" падае вось такую гісторыю аб каню і шапцы. Дзеялася гэта ў Польшчы, ў адным мястэчку Келецкага ваяводзтва.

Прывёў селянін на кірмаш прадаваць каня. Прастаяў цэлы дзень і ніхто больш як 5 зл. за каня не пасуліў. Селянін задумаў над сваім горам пажартаваць. Падышоў, трымаючы на повадзе каня, да шапачніка і пачаў таргаваць шапку. Шапачнік танеі 7 зл. шапкі не аддаваў. Селянін згадзіўся заплаціць за шапку 7 зл., але сказаў шапачніку пачакаць, пакуль ён ад некага прынясе грошы, бо пры сабе ня мае. Прывязаў каня да возу шапачніка і адышоў быццам па грошы з купленай шапкай на галаве. Шапачнік зусім паверыў, бо селянін пакінуў пры яго возе каня. Але селянін да каня не вярнуўся. Шапачнік зразумеў, што селянін пакінуў каня за шапку. Заплата гэная яго аднак не здаваляла і павёў ён каня на рынак, шукаючы таго селяніна. Не нашоўшы селяніна з купленай у яго шапкай, прадаў каня за 6 зл. аднаму пасажыру, які астаўся ад ад'яжджаючага аўтобусу. Новы ўласьнік каня, замест ехаць аўтобусам, паехаў у сваім напрамку конна. Даехаўшы да мэты пусьціў ён каня самапасам, бо ніхто ня купляў, а заплачаная 6 зл. конь апраўдаў яму тым, што ён на ім прыехаў: бо аўтобусам гэтая дарога каштуе тож 6 зл.

Гэта так у Польшчы, а ў нашым краю яшчэ горш.

У лідзкім павеце сэквэстратар прыехаў да аднаго селяніна, каб зыскаць 200 зл. падатку і іншых даўгоў. Зайшоў у хату і там знашоў да паўгола абдзёртага гаспадара, амаль голых, ляжачых ў саломе, якая служыла за пасьцель і прыкрыўку, чацьвёра дзяцей, і застыдаўшуюся чужога чалавека, бо таксама слаба прыкрытую адзежай жонку гаспадара. У хаце ані хусьціны, у каморы пу-

J. Bylina.

MACIEJ.

I.

Žyŭ u siale adzin batrak,
Chiba z babaj, peŭnie-ž tak.
Baby ja adnak nia znaŭ —
Jon daŭno jaje schawaŭ.
Chłopčyk tolki žyć astaŭsia
Siracinkaju ad matki.
Jon ščaśliwa hadawaŭsia:
Byŭ zaŭsiody kruhły, hładki,
Pryhažejšy ad dziaciej.
Što skazać? — na ŭsio siało,
Choć i šmat dziaciej było.
Nazywaŭsia jon Maciej.
A choć baćka i paściŭ —
A synka adnak wučyŭ.
Byŭ jon kiemki da nawuki —
Niepatrebnyja prynuki:
Sam da škoły chłopčyk rwaŭsia
Anikoli nie astaŭsia
Doma korčyć hultaja.
Znali ŭsie tam Macieja,
Nachwalicca nie mahli.
Doŭha z baćkam tak žyli.
Baćka z sił susim ŭžo žbiŭsia,
Pracawać susim nia moh,
Pad kryžom jon skora łoh.
U młynie Maciej zhadziŭsia,
Pamahać tam młynaru
Bolš u nočnuju paru.
Choć i wielmi było trudna,
A Maciej? — jamu nia nudna,
Choć i horam byŭ prybity —
Jon wiasioły, pracawity.
Byŭ jon chłopiec — małajčyna.
Niet i dziwu, što dziaŭčyna
Nie adna jaho lubiła,
Mo' ŭ sakrecie warażyła,
Ci pryjedzie jon u swaty?
Choć Maciej i nie bahaty,
Dy j bahataja z siała
Za Macieja by paŝła.
Stali raić heta ludzi:
„Čom Maciejka tak marudzie"
Raić jošć kamu ŭ tym dziele,
Wioska choča bo wiasiella
Tak, jak ščaścia, ci karyści.
Choć muž žonku budzie hryźci,
A žana mo' što hadzinu
Budzie čyścić mužu ŝpinu,
Chto-ž na to' tahdy zwažaje,
Jak žanicca chłopcy raje:
Heta dobra, to—durnica,
A wun taja pracawita,
Z henaj budzie maładzica,
Ty žanisia, brat, i kwita.
Kab dadać chłapcu adwahu,
Najčaściej tak baba baje:
„A wun hena peŭnie maje
U pančosie i pasahu.
Tolki, widziš, u sakrecie
Heta ja kažu waŝeci."

Chłopiec słuchaŭ, až zdureŭ,
Straciŭ rozum, jaki mieŭ:
Buch u swaty da Maryli,
Bo najbolš jaje chwalili.
A Maryla siniawoka,
Tłusta, kruhła, niawysoka, —
Ŭžo tryccaty jŝoŭ joj hod —
Woćki žmuryć, byccam kot.
Ab Macieju luba mroić,
Tolki, baćyš, fochi stroić:
Što nia treba tarapicca,
Možna troški pačakać,
Pakulšto i nie žanicca.
Tak Macieju stała łhać.
A Maciej nia znaŭ, što wuda
Heta kinuta u bok,
Dy ŭ piatlu, jak hrešny Juda
Samachwoć, niaščasny, skok!
Staŭ prasić jaje niamała,
Pakul „zhoda" nie skazała.
Wot wiasielle adhulali,
Pierš ŭ kaściele pawiančali,
A ciapier pajšla turbota,
Budnia, šeraja rabota,
Što niama joj i kanca...

II.

Ŭžo Maciej naš pryharbiŭsia:
Nie paznaješ małajca,
Chod jahony prytupiŭsia,
Staŭ jakiści zadumiony,
Jak pryhońnik, ci kazionny.
Tak rabiŭ jon kožna dzieła.
A siało usio hudzieła:
Što Maciej prapaŭ na wieki,

Да нас пішуць.

ДА ПРАЦЫ Ў НАРОДЗЕ.

Дзятлава, Наваградзкага павету. На бачынах „Беларускай Крыніцы“ часта чуваць закліканьні: „Арганізуймася! Ідзём да позытыўнай культурна-грамадзкай працы ў арганізацыях!“

З прычыны неадпаведнасьці грунту ня ў кожнай вёсцы можам распачаць працу ў арганізацыі.

Аднак сьведамыя адзінкі не павінны чакаць бяздзейна аж моладзь сама праз сябе зразумее патрэбу аб'еднаньня і распачне грамадзкую працу, а (залежна ад таго з якім элемэнтам маюць сутычнасьць) павінны распачаць прыгатаваўчую працу — пляновую, сыстэматычную, ўсьведамляючую і консэквэнтна імкнуцца да асягненьня вызначаных мэтаў.

Калі дзе паўстае беларуская арганізацыя, то гэта знача, што пэўная група адзінак стаіць ужо на адпаведнай ступені грамадзкага разьвіцьця, што гэная група людзей адчувае нутраную патрэбу супольнай позытыўнай культурнай працы, якую можна толькі вясьці ў арганізацыях, што ў гэнай групе знашліся адзінкі, якія ўзялі на сябе абавязак вясьці арганізацыю, будучы да гэтага адпаведна прыгатаванымі.

Але аграмадныя нашыя гушчы яшчэ адчуваюць патрэбу арганізацыі.

Вось сьведамыя адзінкі ў паасобных вёсках распачынайце акцыю ў кірунку адпаведнага грамадзкага ўсьведамленьня сялян, дзеля прыгатаваньня грунту пад арганізацыю. Напрыклад у вёсцы А. ёсьць людзі граматныя, але яшчэ ня чытаюць беларускага друкаванага слова. Трэба выпісаць на імя больш дзейнай асобы газэту беларускую, згуртаваць каля яе магчымую колькасьць асобаў, зацікавіць беларускім бягучым жыцьцём культурным, грамадзкім, палітычным і г. д., залажыць у каго колечы беларускую бібліятэку прыватную, каб даць магчымасьць жыхарству вёскі пазнаваць сваю культуру, гісторыю, літэратуру і г. д., пазнаваць балячкі нашага народнага жыцьця, што мы маем, а чаго ня маем, да асягненьня чаго маем імкнуцца — даць магчымасьць дасканаленьня сябе, адпаведнага ўзгадаваньня. Калі паасобныя адзінкі створаць сабе супольныя адпаведныя мэты, ідэалы, з якімі зьвяжуцца моцна пачуцьцём, дык урэшце выразіцца свая культурна-грамадзкая сьпеласьць у форме арганізацыі.

Дык вось, каб арганізацыя заложаная не хварэла, не раскідалася, а развівалася, трэба, каб людзі, якія будуць яе тварыць, мелі магчымасьць пачаць працу над сабою. За гэта ёсьць адказны кожны беларускі інтэлігент.

п. і л.

Александравічы, Наваградзкага павету. Сяляне нашай вёскі — беларусы, па веравызнаньні больш каталікоў, як праваслаўных. «Мы веры «польскай», але „непалякі» — выясьняе старэнькі жыхар вёскі. Наагул сьведамасьць нацыянальная ўжо больш як у пачаткавай фазе разьвіцьця.

Ёсьць некалькі асобаў, якія адчуваюць патрэбу чытаць газэты — у вёску прыходзіць 1 экз. „Беларускае Крынiцы“, якою надта цікавяцца паважнейшыя з гаспадароў вёскі, як „Матрос“, Сямён Верабей і іншыя. Пара была-б, каб і моладзь наша перастала праводзіць час пры картах, а ўзяла прыклад з старэйшых і пачала чытаць (выпісаўшы) „Бел. Крыніцу“, „Шлях Моладзі“ і іншыя беларускія часопісі і кнігі. Абавязкава трэба, каб хто з Вас, аляксандраўцы, залажыў беларускую прыватную бібліятэку, каб старэйшыя і моладзь мелі што чытаць, каб маглі як найхутчэй прыгатавацца дзеля залажэньня гуртка БІГіК.

л.

доў пяць бульбы на зіму, у гумне капы дзьве жыта і ахапак іншага збожжа ў снапкох. У хляве ні каня, ні каровы і нават ні аднаго падсьвінака. Пачаў сэквэстратар пытацца суседзяў, чаму гэты селянін такі бедны і высьнілася, што гэта польскі вайсковы асаднік.

Пр.

З Новым Годам!

Беларуская Кнігарня «ПАГОНЯ» ў Вільні, з прычыны Новага 1933 Году, складае Навагоднія пажаданьні ўсім сваім Паважаным Кліентам, дзякуе ім за давер у мінулым годзе і прапануе свае ўслугі на Год Новы, 1933-ці.

Усе апошнія беларускія выданьні, а асабліва БЕЛАРУСКІЯ АДРЫЎНЫЯ КАЛЕНДАРЫ і КАЛЕНДАРЫ КНІЖКІ кнігарня дастаўляе па найтанейшых цэнах

Biełaruskaja Kniharnia „PAHONIA“
Wilnia (Wilno), Zawalnaja wul. № 6—10.

Гутарка Дзядзькі Гаўрылы.

Люблю Цябе, мой Край радзімы,
Люблю я шэпт тваіх лясоў.
Люблю твае палі і нівы,
Люблю пявучасьць родных слоў.
(Сял. Ніва в 1927 г.)

Гэтак сьпяваў малады паэт. Гэтыя словы і мне глыбока заселі ў сэрцы; як іх я успомніў, дык ад радасьці на вачах паказваюцца сьлёзы. Чаму такое пачуцьцё вытвараецца? Сам ня знаю. Хапае мяне нястрыманая радасьць, што растуць кадры маладых людзей, каторыя шчыра кахаюць свой Край. Пашыраецца сьведамасьць і любоў да Бацькаўшчы. Спатыкаюцца яшчэ адзінкі, каторыя крыўляюць польскаю мову, уважаючы яе за „далікатнейшую . Але гэткіх ужо мала. Ох, як-жа сьмешна слухаць, як такі „паляк“ пачне гутарыць папольску!

У часе сьпісу людзей на мае пытаньні: (прызнацца, і я быў камісарам сьпісавым): калі радзіўся, або колькі вам гадоў?— гэтакі бываў адказ: „в ктурым року не вем, але тэрас мам 24 рокув, уродзілася в месіонцу серпню.“ Вось польшчына, аж гадка слухаць! Проста ў вуха коле! Або пойдзеш сумысьне на „забаву“ С.М.П. і паслухаеш; толькі і чуваць: „прошэ пана“ і „прошэн пана“, нават ла сваей роднай сястры, брата, а нават і бацькі ўсё зварачваецца „прошэн пана“. Вось тут, дык ужо далікацтва. Бацька родны, і то папольску пры людзях „пан“, ня гледзячы на тое, што гэты бацька ў хаце дастане ад сына лаянку „па маме“ і панюхае сынавы кулак.

Эх, вы браты і сёстры! Не хвалюся я, але ведаю, што лепш ад вас патраплю гутарыць папольску, аднак гавару толькі гутаркай беларускай, каторая ў інтэлігентным сэрцы заўсёды бывае інтэлігентнай, гэтай мовай я гарджуся прад другімі і кахаю яе, як родная маці кахае дзіцё. — Польскую мову ўжываю ў патрэбе. Моцна мяне цешыць старога, што да нашай роднай мовы і Краю разгарэлася іскра любові ў сэрцах многай нашай моладзі. І ты моладзь, каторая яшчэ калечыш чужую мову, выкінь гэтую прывычку і гутар пасвойму, роднай сваей мовай беларускай.

Дзядзька Гаўрыла.

НАША ПОШТА.

В. Дзякуем. друкуем. пішыце больш. Гадавік вышлем.

М. Пішыце і другіх заахвочвайце.

Б—скі. Дзякуем, карыстаем, друкі пасылаем.

Шпаку. Паслу перадалі, скарысталі, пішыце часьцей.

Futurum. Аб „Новым Знаёмстве“ не прыпамінаем. але пагзядзім, абвестку зьмесьцім, За прысланае дзякуем, выкарыстаем.

Авідаўчуку Дзякуем, скарыстаем,

І—ч. Дзякуем. скарыстаем, пішыце што ў Вас чуваць.

Баранавіцкаму гуртку. Надрукуем карэспандэнцыяй,

ПАПРАЎКА.

У сьпіску кніг вызначаных на прэмію для падпішчыкаў „Беларускай Крыніцы“ памылкова знайшлася «Новая Зямля» — Я. Коласа. Гэтым паведамляем, што „Новая Замля“ ў гэты сьпісак не ўваходзіць.

Замест „Światoj Historyi Nowaha Zakonu“ высылаецца гэткая-ж гісторыя „Staroha Zakonu“.

Адміністрацыя „Бел. Крыніцы“

Što ciarpić ad baby ździeki
Što i dnia niama, kab zwady
Nia było u ichniaj chacie.
Što u ruch iduć pryłady:
Miski, łyžki, pamiało.
Až kančałaś na łapacie;
Trubić wot ab čym siało.

Znali ludzi, znaŭ i Boh —
Pamahčy nichto nia moh.
Žyŭ Maciej, jak byccam struty,
Horš čym kataržnik prykuty.
Na't i žyć jon nie chacieŭ:
Nie ździaržaŭ i... zwarjacieŭ.
Cely dzień usio błukaje,
Ŭžo nia moža pracawać,
Jon ciapier sabie šukaje,
Kab ŭ arendu młyn uziać:
„Och, skažecie ludzi mnie,
Ci nia čuŭ chto ab młynie?“
Z hetaj dumkaj biedny žyŭ,
Z wioski ŭ wiosku ŭsio chadziŭ,
Z joj ustanie, z joj i łaža.
Raz pryšoŭ da žonki j kaža.
„Try młyny ja, widziš, maju,
Z ich ja wybrać nie zhadaju.“

„Dosyć toŭkać jazykom,
Znać ništo ciabie nia rupie,
Skažuć baby ŭsie kruhom,
Što wadu taŭčeš u stupie.
Dyk kab byŭ paśla spakoj:
Chaj paradzić rozum twoj.“
Jak waratkam baba źlita,
Žonka ŭskočyła siardzita:
„Ach taŭkač, palena ty,
Tož ty sam, jak młyn pusty,
Na't choć žorny, nia młyny,
Ci byli ŭ ciabie jany?
Što staiš, jak łysy čort?—
Hlań, warona ŭskočyć ŭ rot.
Dam tabie ja zara radu,
Jak zajedu kijam hadu,
Dyk paličaš, padla, zuby,
Nie paznaje j čort prabłudy.“

III.

Byŭ Maciej ŭwieś z tropu žbity,
Wyhladaŭ niesamawity.
Žwiesiŭ hoławu na hrudzi
Ach, što skažuć ciapier ludzi?
Jak damoŭ išoŭ, chwaliŭsia,
Što za młyn ŭžo začapiŭsia
I zadatku čuć nia daŭ,
Na't z kišeni dastawaŭ,
Tolki toj młynar, psiajucha,
Zaśmiajaŭšysia] da wucha,
„Radźsia, kaža, pierš žany,
Choć ŭsie dobryja młyny.
Chaj ahledzić z-boku z-zadu.
Paśla dašć Macieju radu.
Pierad dobra wyhladaje,
Adnak zad dyk mo' puščaje.
Najważniejša bo tut sprawa
Krepka, ščylnaja zastawa.
Ŭsio skažy Maciej joj śmieła,
A my pośle končym dzieła.“
Coć Macieju było žudka,
Jon da domu išoŭ chutka
Što jon babie swajej skaža?
Jak tut z joj dajšci da ładu?
Jon u myślach słowy waža,
Układaje ich da składu.
Kab skazać ich hetak chwacka
Strojna prost— paadwakacku,
A tut maješ, wo spahuda!
Choć pawieśsia, jak toj Juda,
Abo ŭ wodu skoč i kwita,
Maciej dumaje siardzita.
Paśla wočy jon ŭzdymaje
Akulary papraŭlaje.
Kinuŭ wokam tut niaśmieła,
Moža baba spuścić z tonu,
Pahaworyć mo' pra dzieła. —
Nia kidaje praści łonu:
Karaŭłot usio burčyć,
A Maryla dyk maŭčyć,
A maŭčyć tak, jak zaklata,
Tolki ŭściaž pradzieć zaŭziata,
Časam zmoča palcy ślinka,
Nitka, — byccam pawucinka,
Ŭściaž pływieć iz palcaŭ łoŭka.
Na bok schilena hałoŭka.
Wyhladaje i nia złosna.
A Macieju stała młosna:
Jon stajaŭ, ŭ wačoch ściamnieła,
Pad im nohi zadryželi,
Tolki kryknuŭ: „Končma dzieła!“
I zwaliŭsia la kudzieli.

(d. b.)

Nr. 3. STUDENSKAJA TRYBUNA 8.I.1933.

U NOVYM HODZIE.

Usim našym kaležankam i kaleham žadajem u novym 1933 hodzie ŭsiaho najlepšaha, a pieradusim zdaroŭja i postupu ŭ navucy! Nastupna, niachaj novy hod ulije ŭ našy dušy siłu i advahu zmahacca z nihilistyčna-mistyčnaj idejaj uschodu, jakaja miljony ludcoŭ utapiła ŭ mora śloz i kryvi, i z chvarablivaściaj pažadańnia zachodu. Stańma ŭsie, jak adzin, u rady udarnikaŭ, za vyzvaleńnie nacyjanalnaje i socyjalnaje našaha Biełaruskaha Narodu: kab u budučyni paviavaŭ bieł.-čyrwona-bieły ściah u volnaj i niezaležnaj Biełarusi!

RED. KAL. „STUD. TRYBUNY“.

De Civitate Academica.

Navuka tady tolki staić na vyšyni svajho zadańnia, kali metu maje vykłučna sama ŭ sabie—paznać praŭdu. Zrazumieła hetu dumku hramadzianstva ŭžo ŭ siarednich viakoch i abdaryła najvyšejšyja škoły-universytety aŭtanomijaj, jakaja zakłučajecca ŭ nastupnym: 1. Universytet maje svaju kiraŭničuju ŭładu; 2. volnaść navučańnia; 3. volnaść vybaraŭ novych prafesaroŭ i nadavańnie navukovych tytułaŭ, 4. volnaść vučycca i 5 volnaść akademickaha žyćcia.

1. Kiraŭnikami vyšejšych škoł žjaŭlajucca: Akademicki Senat z vybiranym što hod Rektaram i Vydzialovyja Rady z Dziekanami na čale. Da ich naležać spravy navukovyja i haspadarča-administracyjnyja universytetaŭ, a takža i sud u hranicach ułasnych.

2. Prafesary i docenty akademickich škoł majuć prava padavać i abjaśniać z katedry roznyja pytańni, jakija ŭvachodziać u halinu viedy, katoraj žjaŭlajucca pradstaŭnikami, apirajučysia pry hetym vykłučna na navukovyja dovady, biaz uvahi na toje, ci heta jość dla kahoś karysnym, ci nie.

3. Prafesary nadajuć prava navučańnia na universytecie, i roznyja navukovyja tytuły, biaručy pad uvahu vykłučna navukovuju kvalifikacyju kandydata.

4. Volnaść vučycca adnosicca da studentaŭ. Kožny student maje svabodu paśviačacca studyjam u stasoŭnym dla siabie kirunku, chadzić na ŭsie lekcyi i praktykavańni, u katorych choča brać udzieł. Akramia pracy navukovaj, student nia maje abaviazku ničoha inšaha rabić. Volnaść vučycca nie abaznačaje ničoha nie rabić!

5. Volnaść akademickaha žyćcia — moža najhałoŭniejšy dla Biełarusaŭ punkt — heta jość volnaść arhanizacyi, što prajaŭlajecca ŭ formie hurtkoŭ i sajuzaŭ navukovych, humanitarnych, samadapamahovych, hramadzkich i idejovych, spartovych, tavaryskich i reprezentacyjnych. Tut jość škoła hramadzkaha žyćcia i tut vytvarajecca atmasfera intelektualnaha sužyćcia.

Vonkavym dziejnikam administracyjnym—Ministerstvu Aśviety — prysłuhoŭvuje prava kantroli Universytetaŭ u halinie haspadarča-administracyjnaj.

Aŭtanomija universytetaŭ u Polščy dla biełarusaŭ jość rečaj nadta vialikaj vahi. Studenty-biełarusy majuć abaviazak siańnia nia tolki vučycca, majučprava mieć svaje arhanizacyi, rabić zborki, viečy i t. d., a zaležnymi źjaŭlajucca tolki ad svaich kurataraŭ-prafesaroŭ, jakich na heta stanoviśča sami zaprašvajuć. A naahuł biełarusy na ŭniversytecie čujucca roŭnymi siabrami Akademickaj Respubliki, jak i studenty inšych narodnaściaŭ.

U suviazi z traŭniavym pieravarotam i paŭstaŭšaj tendencyjaj„dziaržaŭnaha ŭzhadavańnia“ moładzi (siańnia prychilnaha da B.B.) paŭstała ŭ Polščy dumka, skasavać aŭtanomiju ŭniversytetaŭ i hetym samym pašyryć metodu „dziaržaŭnaha“ ŭzhadavańnia moładzi i na vyšejšuju školu, dzie moładź, tolki-što vypisaŭšysia z himnazijalnych stralcoŭ, „pryspasabieniaŭ“ i roznych vajskovych „hufcaŭ“, mahła addacca navucy.

Novy prajekt Ministerstva Aśviety adbiraje ad vyšejšych škoł aŭtanomiju, žmianiajučy ich na instytucyi, kiravanyja administracyjnaj uładaj. Art. 3: hetaha prajektu kaža, što rasparadžeńnie ministra aznačaje „hranicy i sposab dziejnaści akademickich škoł.“ Nia chodzić tut ab administracyju universytetaŭ, a tolki ab volnaść navuki i navučańnia, a taksama ab volnaść navučacca i volnaść studenskaha žyćcia. Tut zaŭsiody budzie mieć „voka i vucha“ administracyjny „apiakun“ pry asyście palicyjanta i zaŭsiody budzie mieryć prafesara z punktu hledžańnia „uchiłaŭ,“ jak heta jość na ŭschodzie, a moładź z punktu hledžańnia „dziaržaŭnaha uzhadavańnia.“ Kansekvencyi dla biełarusaŭ bolš čym jasnyja.

Dalej, pavodle prajektu, administracyjnaja ŭłada maje prava začyniać addziely i katedry, pieranasić ich z adnaho miesta ŭ druhoje, abo z adnej škoły ŭ druhuju. Nastupna, ahraničvajecca volny vybar prafesaroŭ i mahli-b tut adyhryvać rol inšyja dziejniki, jak navukovyja kvalifikacyi kandydata.

Naahuł, pavodle ministeryjalnaha prajektu, usia navuka mieła-b być zaležnaj ad źmiennych, a niaraz i škodnych, dziejnikaŭ palityčnych, suproć čaho, u imia dabra i abarony navuki, vystupili ŭsie prafesary vyšejšych škoł u Polščy, nie paminajučy siabroŭ najvyšejšaj polskaj navukovaj instytucyi, Polskaj Akademii Navuk. Taksama ŭsio studenstva pad Polščaj pryniało hety prajekt z abureńniem.

My, studenty-biełarusy, u imia ahulnaludzkoha darobku navuki, a taksama ŭ imia dabra biełaruskaha narodu, pavinny stojka baranić aŭtanomiju vyšejšych škoł pad Polščaj, bo kali my siahońnia, akramia vybranaj navuki i svaich idejova narodnickich arhanizacyjaŭ, ničoha nia majem, dyk pa „reformie“ mohuć nastać časy, što za prykładam siarednich škoł i volnych arhanizacyjaŭ, z akazyi čyichś uradzin, abo imianin, kinuŭšy knižki, budziem z strelbaj na plačach mašyravać pa vulicach universyteckich miestaŭ i piajać bryhadnyja pieśni. A chto viedaje, ci nia zmusiać jašče studenta-akademika vyvučyvacca žyciapisy rožnych stralcoŭ i kamiendantaŭ?

Stud. med. U.S.B. **J. Malecki.**

Volnaja Trybuna.

Naša słabaść i siła.

(*Kančatak*).

Vinavata tut adnak nia tolki sama moładź, ale i jaje vychavaŭcy. Jak-ža sumna robicca, kali ŭspomnim, što paru hadoŭ nazad dziesiatkami vyhaniali našu moładź z himnazijaŭ za palitykanstva.Ci-ž nia vinavatyja tut jość dyrektary i vučyciali, što pazvolili, a na't sami dapamahali(!), zakaranicca ŭ maładych dušach destrukcyjnym elementam?

Dalejšaj słabaściaj našaje intelihiencyi jość razbrod hramadzkaj dumki. Adny stajać za kamunizmam, a nia chočuć zrazumieć taho, što hety hramadzka-palityčny kirunak nia vyjšaŭ siahońnia z ramaŭ teoryi, a praktyka, žyćcio vykaža, nakolki jon jość realny. Rasieja, heta adna 1/6 čaść śvietu, dosyć maje naturalnych bahactvaŭ, ludziej, kab zrabić u siabie dabrabyt. I kali tam zapanuje „abiacany raj,“ to i my biełarusy, jak i ŭsie inšyja narody, pryjmiem hety hramadzki ład. Pakul adnak tam pa turmach črezvyčajak, G.P.U. i Sałovak hibnuć tysiačy ludziej, pakul usio hramadzianstva dumaje tolki ab tym, jak nazaŭtra zdabyć čorny kusok chleba, to hodzi być apostałam hetaj idei i šukać durniejšych ad siabie.

Inšyja, jak np. siabry karparacyi „Skarynija,“upirajucca za połonafilstvam, jak-by nia viedali, što z słabymi nichto nidzie nia ličycca. Adyhryvać-ža rol viečna pakornaha paprasimca z źniataj šapačkaj, nam honar i narodnaja ambicyja nia moža pazvolić. A naastatku, kali palaki i dajuć z svajej starany połonafiłam jakujuś paddzieržku, to tolki tamu, kab razłamić naš adziny front i asłabić nas. Niachaj-by tolki źniknuli siańnia kadry niezaležnikaŭ, dyk usich vyznaŭcaŭ hetaha štučnaha kirunku chlebadaŭcy miatłoj prahoniać.

Kirunak niezaležnicki, choć i značnyja maje ŭpływy pamiž intelihencyi, adnak nia vidać tut šyrejšaha razmachu i bujnaści. Pamima hetaha jon robić svajo „i najdurniejšy siahońnia ŭžo viedaje, što idziom da niezaležnaści;“mienšaje z tym—jakimi darohami. Tolki cichi i spakojny charaktar hetaha kirunku uvažajuć niekatoryja dziejačy za reč dadatniuju, bo na ŭsio treba času, a usio vialikaje uzrastaje pavoli.

Dasiul była mova ab našaj słabaści, a hdzież siła naša?

Siła naša kryjecca ŭ tym, što my: 1 pachodzim z vioski, 2. znajem sialanskuju dušu, 3. vioska nam davieraje i 4. vučamsia.

1. Pachodžańnie naša maje vialikaje značeńnie, bo my znachodzimsia zaŭsiody ŭ kantakcie z narodam, vidzim jaho patreby, paznajom jaho vymahańni i napramak — naahuł paznajom jaho žyćcio.

2. My, jak syny vioski, viedajem, vyčuvajem jaje duch i nastroi, adpaviedna taksama ŭmiejem padyjści. Zasto-ž palaki i rasiejcy tak šukajuć našych renehataŭ?—Jany mohuć lepš razumieć dušu biełaruskuju. Mnoha tož łažyłasia ŭ historyi trudu, kab hety narodny duch pieraviarnuć, a jšče i ciapier zdarajucca vysiłki ŭ hetym kirunku.

3. Svaja intelihiencyja maje davier ŭ narodu; renehaty-ž(vyradki, pradažniki), a taksama i tyja z narodnaj intelihiencyi, chto raz uzłožanych na siabie abaviazkaŭ nia spoŭniŭ, hetaha davieru mieć adnak nia mohuć. U hetym jość niezraŭnanaja vyžšaść sapraŭdnaj narodnaj intelihiencyi nad intelihiencyjaj — vyradkami i padlizami.

4. Apošnim i taksama važnym plusam jość dla nas toje, što my vučymsia, paznajom dabro i praŭdu, paznajom śviet i naša miejsca ŭ im. Adnak i adkaznaść pierad narodam łažyć ahramadnaja.

Z usich hetych adnak dadatnych staron, my tady tolki naležna skarystajem, kali budziem umieć i zachočam karystać. Kab umieć, na toje vučymsia, paznajom svaju minuŭščynu, paznajom svoj siahoniašni stan,i t. d. a zachacieć karystać z svajej siły my pavinny, kali naahuł nia vyhasła ŭ nas iskra lubovi da baćkaŭščyny i svajho narodu. Jak„chacieć“,—kožny maje volnuju ruku, ale zorkaj puciavodnaj pavinien być Akt z 25 sakavika 1918 h.

J. M.

Chronika.

Arhanizacyja biełaruskich studentaŭ u Litvie. Dnia 27 XII 32 zasnavałasia na universytecie Vitaŭta Vialikaha ŭ Koŭnie biełaruskaja studenskaja arhanizacyja „Abjednańnie.“ Niachaj žyvie i pašyrajecca novaja kuźnia našaj intelihiencyi!

U B. S. S., u Vilni, starańniem hrupy kaležanak z N. Haŭryličankaj na čale, adbylisia dva tavaryskija viečary: adzin na raźvitańnie pierad Kaladnimi feryjami, druhaja pierad Novym Hodam na Sylvestra. Haściej zaŭsiody poŭna. atmasfera ščyraj radaści. Brava kaležanki!

Refarat. Kal. Dr. Fr. Hryškievič dn. 10.XII.32 h mieŭ odčyt u B S.S. na temu „Filazofija treciaha pakaleńnia biełaruskaha dumajučaha žyćcia.“ Prelehient svaich pohladaŭ nia vyraziŭ, a ŭsio što skazaŭ, možna ŭniać u nastupnaje nieadkazanaje pytańnie: nakolki palepšaje žyćcio biełaruskaha sielanina i rabotnika, kali na miejscy maskoŭskaha kamisara budzie siadzieć kamisar biełaruski, abo kali biezrabotnych biełarusaŭ budzie uśmirać nia polski palicyjant, ale biełaruski?

Aryštv i zvalnieńni. Kal J. Burak student prava U.S.B. vyjšaŭ z Łukiškaj turmy ŭ Vilni, dzie, jak palitźniavoleny prasiadzieŭ až try tydni. Abvinavačvvaŭsia jon u zbližeńni da kamunistaŭ.— Druhi naš kaleha. J. Kasiak. stud. mastackaha Addziełu U.S.B. ad daŭžejšaha času siadzić za padobnuju spravu na Łukiškach. Škada talentu hetaha maładoha i nadziejnaha mastaka!

Беларуская Кнігарня Ст. Станкевіча
ВІЛЬНЯ, Вострабрамская 2
прапануе
БЕЛАРУСКІЯ КАЛЕНДАРЫ НА 1933 ГОД:
1) Беларускі адрыўны календар — 75 грошай.
2) „ народны календар — 60 „
3) „ календар рэліг. зьместу 50 „
Сьценкі да календароў на розныя цэны.
Перасылка адрыўнога календара 25 гр.; кніжкі 15 гр.
Хто выпісывае 10 календароў за перасылку ня плаціць.
Заказы высылаюцца па атрыманьні ўсіх грошай.
Большыя заказы высылаюцца па атрыманьні задатку.
Для перапрадаўцоў вялікая ўступка.

Redakcyjnaja Kalehija „Studenskaj Trybuny“ — u składzie kal. kal.: M. Tatarynovičanka, J. Šutovič i J. Malecki
Sekretaryjat „Stud. Trybuny“ čynny kožnuju niadzielu miž 11—12 hadz. pry vul. Ludvisarskaj 1—19.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.